Крыж як доказ любові

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.09.2021 00:00



14 верасня адзначаецца Свята Узвышэння Святога Крыжа. Чаму мы ўшаноўваем крыж, хоць ён з’яўляецца інструментам жорсткай смерці і сімвалам найгоршых пакут?

†

Крыж блізкі і дарагі нашаму сэрцу. Змяшчаем яго на сцяну кватэры, паказваем дзецям, каб яны пазналі ды ўпадабалі любоў Езуса і ў святле крыжа выраслі смелымі ды ахвярнымі людзьмі. Маленькі крыжык бацькі вешаюць на шыю дзіцяці, калі яно ўпершыню прыступае да св. Камуніі, а таксама са слязамі ў вачах дрыготкай рукой крэсляць знак крыжа на яго лбе, бласлаўляючы ў дзень шлюбу. Да крыжа працягваюць сваю руку хворыя людзі, шукаючы ў ім сілы ў цярпенні. Чалавек, які памірае, бярэ ў рукі крыж, каб у гадзіну смерці развітацца з зямным жыццём ды прывітаць вечнасць. І на хрысціянскай магіле ставіцца крыж.

Чаму мы ўшаноўваем крыж? Чаму бярэм яго ў рукі, хоць з’яўляецца інструментам жорсткай смерці? Чаму шукаем яго, нягледзячы на тое, што гэта сімвал найгоршых пакут? Чаму становімся на калені пад крыжам, схіляем перад ім галаву? Чаму з любоўю і пашанай цалуем яго?

Крыж з’яўляецца выратаваннем, збаўленнем, месцам аздараўлення і напаўнення жы

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.09.2021 00:00


Крыж – найвялікшы і самы пераканаўчы доказ Божай любові да чалавека. Бог на крыжы прызнаўся ў любові: не словам, а змучаным целам; не вуснай заявай, а кроўю, што цякла з ран. Можна памерці з-за недахопу любові альбо з-за яе. Абедзве сітуацыі адносім да Езуса, які памёр на крыжы як нехта адкінуты, нялюбы і адначасова як Той, хто любіць да канца, без абмежаванняў. Хрыстос учыніў крыж знакам сапраўднай любові – даруючай і гаючай.

Крыж – гэта таксама знак даравання Бога, які, гледзячы на жаль і пакорную просьбу грэшніка, прабачае яму нават самыя вялікія грахі. З вышыні крыжа любоў Усемагутнага сыходзіць на чалавека і саграваe яго, як сонечныя прамяні. Бог дакранаецца любоўю да балючых ран нашага жыцця. І мы спазнаём прабачэнне, вылячэнне, адпушчэнне грахоў цаной ахвяры Хрыста, які прынізіў сябе, будучы паслухмяным ажно да смерці. Таму Бог узвысіў Яго па-над усім (параўн. Флп 2, 8–9).

Крыж быў узвышаны і асвечаны самім Хрыстом. Праз Яго крыжовую ахвяру Бог “узняў” чалавека. Паказаў моц любові, якая вызваляе ад зла, вяртае надзею, перадае сапраўднае жыццё. Любоў, што выцякае з крыжа, вяртае чалавеку належную годнасць.

Крыж як доказ любові

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.09.2021 00:00



Крыж як доказ любові

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.09.2021 00:00